

ДУА "Сярэдняя школа №1 г.Сянно імя З.І.Азгура

***У дапамогу вучням***



# *Памяткі па беларускай мове*

***Памятка па рабоце над памылкамі па беларускай мове***

***1.Пропуск ці замена літар.***

Напішы слова правільна, падкрэслі літару, пастаў націск. Запішы слова яшчэ раз, падзяляючы яго на склады.

***2.Знакі прыпынку ў канцы сказа.***

Напішы сказ, пастаў патрэбны знак, падкрэслі яго. Прыдумай і запішы яшчэ адзін сказ з такім знакам прыпынку.

***Запомні!*** У канцы сказа ставіцца кропка (.), пытальнік (?), клічнік (!). Выбар знака прыпынку залежыць ад сэнсу сказа і інтанацыі, з якой ён вымаўляецца.

***3.Вялікая літара ў словах.***

Напішы слова правільна. Запішы яшчэ два словы на гэта правіла, падкрэслі вялікую літару.

***Запомні!*** Імёны, імёны па бацьку, прозвішчы, мянушкі жывёл, назвы краін, гарадоў, вёсак, вуліц, рэк, азёр, мораў пішуцца з вялікай літары.

***4.Перанос слоў.***

Напішы слова правільна, падзяляючы яго на склады для пераносу. Запішы яшчэ тры словы, падзяляючы іх для пераносу.

***Запомні!*** Словы трэба пераносіць па складах. Адну літару нельга пакідаць на радку ці пераносіць на другі радок. Літары й, ў,ь проы пераносе нельга аддзяляць ад папярэдняй літары. Пры пераносе слоў літары дж, дз падзяляць нельга.

***5.Слоўнікавыя словы.***

Напішы слова правільна, падзялі яго на склады, пастаў націск.

***Запомні!*** Напісанне гэтых слоў трэба паглядзець у слоўніку і запомніць.

***6.Правапіс ў.***

Напішы слова або словазлучэнне правільна. Запішы яшчэ два словы на гэта правіла, падкрэслі галосную перад ў.

***Запомні!*** Літара ў пішацца заўсёды пасля галосных у сярэдзіне слова, у канцы і ў пачатку, калі папярэдняе слова заканчваецца на галосную. Пасля знакаў прыпыгку пішацца толькі у складовае. Літара ў не бывае вялікай.

***7.Правапіс галосных о,э,а.***

Напішы слова правільна. Запішы, ад якога слова яно ўтварылася, пастаў націск. Запішы яшчэ два словы на гэта правіла.

***Запомні!*** У беларускай мове галосныя о і э могуць быць толькі пад націскам. Не пад націскам пішацца літара а. Словы-выключэнні: тэлеграма, тэатр, дэталь, тэлефон, ордэн і інш.

***8.Правапіс галосных е,ё,я.***

Напішы слова правільна, пастаў яго ў множным ліку, абазнач націск. Запішы яшчэ два словы на гэта правіла.



## МАРФАЛАГІЧНЫ РАЗБОР

### НАЗОЎНІК

1. Пачатковая форма (назоўны склон адзіночнага ліку).
2. Агульны або ўласны .
3. Адушаўлёны або неадушаўлёны.
4. Канкрэтны або абстрактны.
5. Мужчынскага, жаночага, ніякага або агульнага роду.
6. Першага, другога, трэцяга скланення, рознаскланяльны або нескланяльны.
7. Склон.
8. Лік.
9. Сінтаксічная роля ў сказе.

### ПРЫМЕТНІК

1. Пачатковая форма (назоўны склон адзіночнага ліку мужчынскага роду).
2. Разрад паводле значэння (якасны, адносны, прыналежны).
3. Ступень параўнання (для якасных) : вышэйшая, найвышэйшая (калі такая ёсць).
4. Поўны ці кароткі
5. Род.
6. Лік.
7. Склон.
8. Сінтаксічная роля ў сказе.

### ЛІЧЭБНІК

1. Пачатковая форма (назоўны склон).
2. Разрад па значэнню (колькасны або парадкавы).
3. Разрад па структуры (просты, састаўны або складаны).
4. Склон (для колькасных).
5. Род, лік, склон (для парадкавых).
6. Сінтаксічная роля ў сказе.

### ЗАЙМЕННІК

1. Цачатковая форма (назоўны склон адіночнага ліку).
2. Разрад паводле значэння.
3. Род (калі ёсць).
4.Склон.
5.Лік (калі ёсць).
6.Асоба (для асабовых).
7.Сінтаксічная роля ў сказе.

### Рэкамендацыі да работы над сачыненнем

1. Дакладна вывучайце тэксты мастацкіх творау і літаратуразнаучыя працы.
2. Перш, чым прыступіць да работы над сачыненнем, прадумайце, які матэрыял для раскрыцця тэмы падабраць.
3. Прагледзьце уважліва свае сшыткі па літаратуры, дзе змешчаны разнастайныя планы, тэзісы, падбор цытат.
4. Памятайце, што і эпіграф, і план, і ізлажэнне матэрыялу у сачыненні павінны адпавядаць тэме.
5. Захоувайце суразмернасць частак у сачыненні.
6. У сачыненні абгрунтоувайце свае думкі цытатамі і прыкладамі, рабіце парауннанні, вывады, выказвайце свае меркаванні.
7. Галоунае, аб чым неабходна памятаць,-самастойнае выкананне работы.
8. Старайцеся выражаць думкі дакладнай і яснай мовай.
9. Бездакорная знешняя форма сачынення (прыгожы почарк, размеркаванне тэкста сачынення: загаловак, эпіграф, план, асобныя часткі).

Літаратуразнаучы аналіз мастацкага твора.

1. Агульная характарыстыка гістарычных абставін, у якіх быу напісаны твор.
2. Якое месца займае твор у сістэме літаратурнай дзейнасці пісьменніка?
1. Да якога перыяду ен адносіцца?
2. Ці працавау аутар у час напісання гэтага твора над іншымі?
3. Звесткі аб:
1. Даце першай публікацыі.
2. Уплыве твора на свядомасць чытачоу, фарміраванне грамадскай думкі.
3. Ацэнка твора, яго ідэйнай накіраванасці у сувязі з гістарычна-палітычнымі зменамі у грамадстве.
4. Характарыстыка ідэйнага зместу твора.
5. Вашы асабістыя адносіны да мастацкага твора.
6. Месца твора у гісторыі культуры.
7. Характарыстыка:
1. Часу, падзеі, якія апісваюцца у творы.
2. Персанажау.
3. Асабістасці сюжэта, кампазіцыі, стылю твора.
4. Праблематыкі, канфлікту.



***7.Правапіс галосных о,э,а.***

Напішы слова правільна. Запішы, ад якога слова яно ўтварылася, пастаў націск. Запішы яшчэ два словы на гэта правіла.

***Запомні!*** У беларускай мове галосныя о і э могуць быць толькі пад націскам. Не пад націскам пішацца літара а. Словы-выключэнні: тэлеграма, тэатр, дэталь, тэлефон, ордэн і інш.

***8.Правапіс галосных е,ё,я.***

Напішы слова правільна, пастаў яго ў множным ліку, абазнач націск. Запішы яшчэ два словы на гэта правіла.

***Запомні!*** У беларускай мове замест літар е,ё ў першым складзе перад націскам пішацца я. Словы-выключэнні: медаль, метро, легенда, пенал, спектакль, мелодыя, белерына, секунда, аперацыя, герой, метал і інш.

***9.Парныя звонкія і глухія зычныя.***

Напішы слова правільна, падбяры праверачнае. Запішы яшчэ два словы на гэта правіла.

***Запомні!*** Напісанне слоў з парнымі зычнымі на канцы слова і перад глухімі зычнымі трэба правяраць. Для гэтага неабходна падабраць праверачнае слова з дадзеным гукам у моцнай пазіцыі (перад галосным).

***10.Абазначэнне мяккасці зычных на пісьме мяккім знакам.***

Напішы слова правільна. Запішы яшчэ два словы на гэта правіла, падкрэслі зычную разам з ь.

***Запомні!*** Мяккасць зычных гукаў абазначаецца на пісьме мяккім знакам, а таксама літарамі е,ё,я,і,ю.

***11.Зычныя б,п,ф на канцы слоў.***

Напішы слова правільна. Запішы яшчэ два словы на гэта правіла, падкрэслі зычныя гукі на канцы слоў.

***Запомні!*** Зычныя б,п,ф на канцы слоў заўсёды вымаўляюцца цвёрда, таму на пісьме мяккі знак пасля іх не ставіцца.

***12.Зычныя дж, ж, ч, ш, р і галосныя пасля іх.***

Напішы слова правільна. Запішы яшчэ два словы на гэта правіла, падкрэслі зычеую разам з галоснай.

***Запомні!*** Зычныя ж,дж,ч ,ш, р – зацвярдзелыя, Яны заўсёды вымаўляюцца цвёрда. Пасля іх пішуцца галосныя а, о, у, э, ы.

***13.Правапіс д, дз.***

Напішы слова правільна. Запішы яшчэ 2 словы на гэта правіла, падкрэслі зычную разам з галоснай.

***Запомні!*** У беларускай мове гук д заўсёды толькі цвёрды, а гук дз – мяккі. Пасля д пішуцца літары а, о, у, ы, пасля дз – літары я, е, ё, ю, і, ь.

***14.Правапіс т, ц.***

Напішы слова правільна. Запішы яшчэ 2 словы на гэта

вымаўляюцца цвёрда. Пасля іх пішуцца галосныя а, о, у, э, ы.

***13.Правапіс д, дз.***

Напішы слова правільна. Запішы яшчэ 2 словы на гэта правіла, падкрэслі зычную разам з галоснай.

***Запомні!*** У беларускай мове гук д заўсёды толькі цвёрды, а гук дз – мяккі. Пасля д пішуцца літары а, о, у, ы, пасля дз – літары я, е, ё, ю, і, ь.

***14.Правапіс т, ц.***

Напішы слова правільна. Запішы яшчэ 2 словы на гэта правіла, падкрэслі зычную разам з галоснай.

***Запомні!*** У беларускай мове гук т заўсёды толькі цвёрды, а гук ц – мяккі. Пасля т пішуцца літары а, о, у, ы, э. Пры змякчэнні цвёрды гук т змяняецца мяккім ц. Мяккасць ц абазначаецца літарамія, е, ё, Ю, і, ь. У беларускай мове ёсць і цвёрды гук ц: цэгла, цыбуля, цукар.

***15.Правапіс падоўжаных зычных.***

Напішы слова правільна, падзяляючы яго ьдля пераносу. Запішы яшчэ 2 словы на гэта правіла.

***Запомні!*** Падоўжанае вымаўленне зычных з, л, к, с, ц, ш на пісьме перадаецца дзвюма літарамі. Падоўжанае дз на пісьме перадаецца спалучэннем літар ддз: суддзя, разводдзе.

***16.Правапіс апострафа.***

Напішы слова правільна. Запішы яшчэ 2 словы на гэта правіла, падкрэслі літары, якія раздзяляюцца апострафам

***Запомні!*** У некаторых словах зычныя з галоснымі е, ё, і, ю, я вымаўляюцца раздзельна. На пісьме такое вымаўленне абазначаецца апострафам.

***17.Раздзяляльны мяккі знак.***

Напішы слова правільна. Запішы яшчэ 2 словы на гэта правіла, падкрэслі ь і літару, якая стаіць перад ім.

***Запомні!*** Раздзяляльны мяккі знак пішацца пасля л перад галоснымі ё, е, і, ю, я.

***18.Правапіс прыназоўнікаў.***

Напішы правільна прыназоўнік і слова, да якога ён адносіцца, паміж прыназоўнікам і словам устаў пытанне або іншае слова.

***Запомні!*** У, на, за, са, да, па, з, пад, каля і інш – прыназоўнікі. З іншымі словамі яны пішуцца асобна.

***19.Правапіс не з дзеясловамі.***

Напішы правільна дзеяслоў і часціцу не. Запішы яшчэ 2 дзесловы з часціцай не.

***Запомні!*** Не з дзеясловамі пішацца асобна.



адносіцца, паміж прыназоўнікам і словам устаў пытанне або іншае слова.

***Запомні!*** У, на, за, са, да, па, з, пад, каля і інш – прыназоўнікі. З іншымі словамі яны пішуцца асобна.

***19.Правапіс не з дзеясловамі.***

Напішы правільна дзеяслоў і часціцу не. Запішы яшчэ 2 дзесловы з часціцай не.

***Запомні!*** Не з дзеясловамі пішацца асобна.

***20.Аднародныя члены сказа.***

Напішы сказ правільна, падкрэслі патрэбныя знакі прыпынку. Запішы яшчэ адзін сказ з аднароднымі членамі.

***Запомні!*** Члены сказа, якія адказваюць на адго і тое ж пытанне і звязаны па сэнсу з адным і тым жа словам, называюцца аднароднымі. На пісьме паміж аднароднымі членамі сказа ставіцца коска. Аднародныя члены сказа могуць быць звязаны злучнікамі. Перад злучнікамі а, але заўсёды ставіцца коска. Перад злучнікамі і, ці, або, калі яны ужываюцца ў сказе адзін раз, коска не ставіцца.

***21.Правапіс канчаткаў назоўнікаў.***

Напішы слова правільна, вызнач слаіненне, склон, від асновы.

***Запомні!*** Каб праверыць, які канчатак трэба напісаць, неабходна:

1.Вызначыць скланенне і склон назоўніка.
2.Вызначыць, на які гук заканчваецца аснова слова.
3.Праверыць канчатак назоўніка па табліцы.

***22.Правапіс канчаткаў прыметнікаў.***

Напішы прыметнік разам з назоўнікам, да якога ён адносіцца, вызнач лік, род, склон назоўніка (прыметнік заўсёды стаіць у тым жа родзе, ліку і склоне, што і назоўнік)

***23.Правапіс канчаткаў дзеясловаў.***

Напішы слова правільна, абазнач канчатак, утвары неазначальную форму дзеяслова, вызнач спражэнне. Запішы яшчэ 2 словы з такім жа канчаткам.